Аддзел культуры Пружанскага райвыканкама
Музей-сядзіба "Пружанскі палацык"

**"Заходнебеларускі рэгіен у паўстанні 1863 – 1864 гг."**

(да 150-годдзя з пачатку нацыянальна-вызваленчага паўстання пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага)

Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя

Пружаншчына з'яўляеццца ўнікальным гісторыка-геаграфічным і этнаграфічным рэгіенам Беларусі, з якім звязаны значныя падзеі і імены беларускай мінуўшчыны.

На працягу апошніх гадоў значную ролю ў папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны рэгіена і краязнаўчым руху іграе музей-сядзіба "Пружанскі палацык". Навуковыя супрацоўнікі музея маюць шырокую тэматыку даследаванняў, у тым ліку яны займаюцца вывучэннем і зборам матэрыялаў па гісторыі паўстання 1863 – 1864 гг. на Пружаншчыне, якая была адным з цэнтраў фарміравання першых аддзелаў інсургентаў у Беларусі і месцам баёў у лютым – верасні 1863 г. З нашым рэгіёнам звязаны імены кіраўнікоў і актыўных удзельнікаў вызваленчага руху – Валерыя Урублеўскага, Рамана Рагінскага, Станіслава Сангіна, Фелікса Зянковіча, Люцыяна Крашэўскага, Аляксандра Акінчыца, Фелікса Улодака, Густава Стравінскага і інш. Да сенняшняга дня ў раёне захаваліся матэрыяльныя сведчанні падзеі – магіла паўстанцаў К.Каліноўскага ў в.Ласасіна. У фондах музея знаходзіцца шэраг дакументаў, якія характарызуюць сітуацыю ў краі ў 1860-я гг. Супрацоўнікі музея-сядзібы "Пружанскі палацык" неаднаразова выступалі ў прэсе з публікацыямі, прысвечанымі знакамітым землякам – удзельнікам выступлення – Ф.Зянковічу і А.Акінчыцу і інш.

У 2013 г. музей-сядзіба "Пружанскі палацык" ініцыіраваў шэраг новых праектаў, звязаных з правядзеннем юбілейных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 150-годдзя паўстання 1863 – 1864 гг. Запланавана публікацыя матэрыялаў і выступленняў на радыё пад агульнай назвай "Хроніка паўстання на Пружаншчыне", правядзенне навукова-практычнай канферэнцыі і мемарыяльныя мерапрыемствы каля магілы паўстанцаў у в.Ласасіна.

У год 150-годдзя з часоў паўстання 1863 – 1864 г. неабходна ўзгадаць аб важнай падзеі нашай гісторыі, абагульніць навуковыя і краязнаўчыя даследаванні па ўзгаданай тэматыцы з мэтай аднаўлення гістарычнай праўды аб паўстанні ў заходнебеларускім рэгіене, сістэматызацыі ведаў аб выступленні, а таксама вызначыць далейшыя накірункі ў справе вывучэння грамадска-палітычнага і культурнага жыцця Беларусі другой паловы XIX ст., якое аказала вызначальны ўплыў на далейшы лёс нашай краіны.

**Праблемы для абмеркавання:**

- Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча зямель Заходняй Беларусі ў канцы 50-х – 60-я гг. XIX ст.;
- Грамадска-палітычны рух у Гродзенска-Берасцейскім рэгіёне ў 50 – 60-я гг. XIX ст.;
- Удзельнікі паўстанцкага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі;
- Баявыя дзеянні на беларуска-польскім памежжы ў 1863 – 1864 гг.;
- Сістэма кіравання паўстаннем 1863 – 1864 гг. у Беларусі;
- Сацыяльна-нацыянальныя праекты напярэдадні і ў перыяд паўстання;
- Палітыка расійскага царызму ў часы паўстання і пасля яго ў дачыненні да зямель Беларусі;
- Адлюстраванне падзей паўстання 1863 – 1864 г.г. у літаратуры і мастацтве;
- Уплыў паўстання на фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі;
- Гістарыяграфія праблемы ў гістарычнай навуцы.

Час правядзення канферэнцыі: **12 – 13 красавіка 2013 г.**

Месца правядзення канферэнцыі – г.Пружаны, Музей-сядзіба "Пружанскі палацык".

Заявы на ўдзел у канферэнцыі і тэксты дакладаў прымаюцца да **1 красавіка 2013 г.** Тэксты дакладаў будуць апублікаваны пасля канферэнцыі. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заяў на ўдзел у канферэнцыі і тэкстаў дакладаў! Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да **5 красавіка 2013 г.**

У заяве паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую ен прадстаўляе, адрас і кантактныя тэлефоны. У заяве таксама неабходна указаць запатрабаванасць месца для пражывання.

Патрабаванні да тэкстаў дакладаў: электронны варыянт не болей за 20 тыс. знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская.

Заявы на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце:

Кантакт: Зялевіч Юрый Сяргеевіч,
225133, г. Пружаны, вул. Савецкая, 50,
Тэл. (016) 329-03-06, факс (016) 322-13-05
e-mail: palacyk@tut.by

Праезд і пражыванне аплочваецца ўдзельнікамі канферэнцыі.
Харчаванне аплочваецца арганізатарамі канферэнцыі.

Аргкамітэт